# Акцыя ў рамках рэалізацыі экалагічнай ініцыятывы «Павышэнне энергаэфектыўнасці і экалагічнасці сістэмы вулічнага асвятлення г. Ашмяны»

Супрацоўнікі і атрымальнікі паслуг аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСОН Ашмянскага раёна” прынялі ўдзел у рэалізацыі экалагічнай ініцыятывы “Павышэнне энергаэфектыўнасці і экалагічнасці сістэмы вулічнага асвятлення г.Ашмяны". Ініцыятыва рэалізуецца пры падтрымцы праекта "Далучэнне грамадскасці ў экалагічны маніторынг і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні", што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

Адказваючы на пытанні пажылыя грамадзяне адзначылі, што ўкараненне дадзенай ініцыятывы паляпшае якасць асвятлення ў горадзе, вырашае эканамічныя пытанні, павышае ўзровень экалагічнай культуры. Праблема энергазберажэння і энергаэфектыўнасці сёння актуальная як ніколі. Разумнае спажыванне рэсурсаў-вось што важна для экалогіі і наступнага існавання чалавецтва.




